ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

Цяжка ў вучэнні — лёгка ў баі

Спікер верхняй палаты наведаў вучэбныя ўстановы, якія рыхтуюць будучых ваенных

Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, наведаў факультэт Генеральнага штаба Узброеных Сіл і камандна–штабны факультэт Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь.

У ходзе мерапрыемства ён азнаёміўся з арганізацыяй падрыхтоўкі афіцэрскіх кадраў аператыўна-тактычнага і аператыўна-стратэгічнага ўзроўняў для Узброеных Сіл Беларусі, іншых войскаў і воінскіх фарміраванняў, выступіў перад афіцэрамі па актуальных пытаннях нацыянальнай бяспекі краіны.

Законы патрабуюць удасканалення

За першы квартал гэтага года сенатары разгледзелі больш за тысячу зваротаў

На мінулым тыдні адбылося пасяджэнне Прэзідыума Савета Рэспублікі. Падчас яго былі разгледжаны пытанні аб удзеле членаў Савета Рэспублікі ў мерапрыемствах міжнароднага характару, узнагароджанні Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, а таксама прааналізавана работа са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб па выніках I квартала 2017 года.

Так, за гэты перыяд членамі Савета Рэспублікі, якія працуюць у рэгіёнах, разгледжана 1167 зваротаў грамадзян і юрыдычных асоб, непасрэдна ў Савеце Рэспублікі — 206 зваротаў. Членамі Прэзідыума Савета Рэспублікі праведзена 11 асабістых прыёмаў грамадзян, у тым ліку 5 выязных, членамі Савета Рэспублікі — 280 асабістых прыёмаў грамадзян, уключаючы 109 выязных.

Пытанні, з якімі звярталіся да парламентарыяў, у першую чаргу звязаны з прапановамі па ўдасканаленні заканадаўства. Грамадзяне выказвалі думкі пра законапраекты, якія знаходзяцца на стадыі падрыхтоўкі да разгляду ў парламенце, прапановы, якія датычацца карэкціроўкі прававых актаў, рэалізацыя якіх на практыцы, на іх думку, патрабуе ўдасканалення.

Шэраг зваротаў быў прысвечаны жыццёва важным для людзей пытанням, сярод якіх паляпшэнне жыллёвых умоў, прыватызацыя жылля, рамонт і эксплуатацыя жыллёвага фонду, будаўніцтва і землекарыстанне, работа арганізацый сістэмы жыллёва-камунальнай гаспадаркі і жыллёвага забеспячэння, працы і сацыяльнай абароны, аховы здароўя, адукацыі.

Усе праблемы важныя

Члены Савета Рэспублікі правялі сустрэчы з выбаршчыкамі

Сенатары зладзілі прыёмы грамадзян, якія з'яўляюцца традыцыйнай практыкай для непасрэднага рашэння іх праблем.

Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, начальнік Лунінецкага раённага вузла паштовай сувязі Брэсцкага філіяла «Белпошты» Ніна ДУДАРГА правяла выязны прыём грамадзян у Лунінскім сельвыканкаме, пасля завяршэння якога парламентарый і кіраўніцтва выканкама абмеркавалі стан спраў на тэрыторыі сельсавета і намецілі планы па далейшым узаемадзеянні. Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, дырэктар ААТ «Азярыцкі-Агра» Ніна ЖАЛЯЗНОВА правяла асабісты прыём грамадзян Смалявіцкага раёна. Абодва парламентарыі далі адказы і тлумачэнні ўсім ахвотным. Было станоўча вырашана пытанне аб працаўладкаванні ў ААТ «Азярыцкі-Агра» аднаго з заяўнікаў.

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

ПАРТНЁРСТВА

Сувязь праз рэгіёны

Энергазбераржэнне стала адным з ключавых пытанняў на пасяджэнні Бюро CORLEAP (Канферэнцыя рэгіянальных і мясцовых органаў улады Усходняга партнёрства), якое прайшло на пачатку тыдня ў Мінску. Як адзначыў старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, гэта тэма вельмі актуальная для краін, якія не валодаюць магутнымі энергетычнымі рэсурсамі. «У нашы планы ўваходзіць удасканаленне заканадаўства па пытаннях энергазбераржэння», — падкрэсліў ён.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Велізарную ролю мясцовых органаў улады ў гэтым пытанні бачыць сустаршыня Бюро CORLEAP, **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандр ПАПКОЎ.** «Мясцовыя ўлады здольны змяняць правілы і нормы працы за кошт вызначэння новых тэндэнцый і ўкаранення інавацыйных тэхналогій, скарачаючы выкіды вуглякіслага газу ў сваіх рэгіёнах. Таму неабходна імкнуцца да больш цеснага супрацоўніцтва рэгіянальных і мясцовых улад з дзяржаўным сектарам для забеспячэння большага ўплыву на грамадскую думку, а таксама да мабілізацыі прыватных і дзяржаўных рэсурсаў для вырашэння пытанняў экалогіі, клімату і энергаэфектыўнасці».

Старшыня Савета Рэспублікі на сустрэчы з сустаршынёй CORLEAP, старшынёй камітэта рэгіёнаў Еўрапейскага саюза Марку Маркула выказаў пяць прапаноў па развіцці супрацоўніцтва. Сярод іх, напрыклад, арганізацыя ў камітэце рэгіёнаў Еўрасаюза беларускай тэматычнай выстаўкі. Да таго ж Міхаіл Мясніковіч адзначыў пазітыўную дынаміку ў супрацоўніцтве з ЕС. «Мы лічым, што гэта толькі пачатак вялікай дарогі, і будзем зацікаўлены ў тым, каб і далей развіваць нашы адносіны з Еўрасаюзам», — сказаў ён.

Што датычыцца эканамічнага развіцця і ролі ў ім мясцовых улад, старшыня Савета Рэспублікі адзначыў, што «ў нас рэгіёны маюць сур'ёзныя правы ў бюджэтнай палітыцы, у пытаннях уласнасці і выбарчага права. Я лічу, што гэтыя тры напрамкі з'яўляюцца ключавымі. Што датычыцца бюджэтнай палітыкі, то ў гэтым пытанні рэгіёны валодаюць досыць вялікімі паўнамоцтвамі. Мясцовыя бюджэты складаюць 16,3% ад ВУП, 57% ад кансалідаванага бюджэту краіны знаходзіцца ў распараджэнні рэгіянальных улад. Па ўсярэдненых паказчыках бюджэтнай палітыкі па краінах Арганізацыі эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця, там мясцовыя бюджэты складаюць 16,6% ад ВУП і каля 40% ад кансалідаванага бюджэту знаходзіцца ў распараджэнні рэгіёнаў. У гэтым плане ў нас рэгіёны валодаюць нават большымі бюджэтнымі магчымасцямі, чым у краінах АЭСР. У нас выконваецца базавы падыход Еўрапейскай хартыі мясцовага самакіравання». Дарэчы, Беларусь за апошняе дзесяцігоддзе павялічыла ВУП у 1,6 разу, не нарошчваючы аб'ёмы спажывання энергарэсурсаў.

Старшыня Камітэта рэгіёнаў Еўрапейскага саюза Марку МАРКУЛА падкрэсліў, што сёння Еўрапейскі саюз супрацоўнічае па лініі Усходняга партнёрства з шасцю краінамі, у тым ліку з Беларуссю. Гэта дае магчымасць выкарыстоўваць назапашаны вопыт у развіцці рэгіянальнай палітыкі. «Мы гаворым пра тое, што органы мясцовай улады, рэгіянальнай улады павінны адыгрываць сёння больш актыўную ролю. І мы з вамі таксама кажам аб нашай асноўнай мэце, якая заключаецца ў тым, каб дапамагчы органам мясцовага кіравання. У тым ліку каб краіны Усходняга партнёрства павышалі ўзровень жыцця сваіх грамадзян».

Удзельнікі пасяджэння разгледзелі таксама пытанні занятасці насельніцтва, развіцця турызму і ролю мясцовых органаў улады ў гэтым. Да таго ж падчас пасяджэння былі абмеркаваны асноўныя рэкамендацыі да пятага саміту Усходняга партнёрства, які пройдзе 24 лістапада ў Бруселі.

Надзея АНІСОВІЧ. *anisovich@zviazda.by*

МАЛЫ БІЗНЕС

АДКРЫЦЬ У САБЕ... ПРАДПРЫМАЛЬНІКА

У красавіку Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ініцыяваў грамадскае абмеркаванне пакета прававых актаў па стымуляванні дзелавой актыўнасці і выключэнні залішніх патрабаванняў да бізнесу. Месяц грамадзяне і прадпрымальнікі ўносілі свае прапановы наконт таго, якім яны бачаць заканадаўства ў гэтай сферы. Грамадскае абмеркаванне скончана. Цяпер пакет дакументаў дапрацоўваецца рабочай групай і ў найбліжэйшы час будзе накіраваны ў Адміністрацыю Прэзідэнта.

Старшыня Беларускага саюза прадпрымальнікаў Аляксандр КАЛІНІН падкрэслівае, што гэты пакет дакументаў з'яўляецца лагічным працягам Дырэктывы №4, якая, як стратэгічны дакумент, вызначыла развіццё малога і сярэдняга бізнесу ў нашай краіне. «Гістарычная мэта — давесці долю малога і сярэдняга бізнесу і долю дзяржаўнага бізнесу да суадносін 50 на 50, каб стварыць устойлівую шматукладную эканоміку. Пакет дакументаў, які цяпер абмяркоўваецца, адпавядае знешнім выклікам, якія ўзніклі ў апошні час. На жаль, крызісныя з'явы вакол нашай краіны вядуць да таго, што ў нас затармазіліся тэмпы развіцця малога бізнесу, нават у мінулым годзе крыху ўпала занятасць у адпаведным сектары. Таму прыняцце гэтага дакумента будзе стымуляваць рост заработнай платы ў прыватных структурах і стварэнне новых працоўных месцаў».

У грамадскія прыёмныя «Белай Русі» паступіла, напрыклад, больш за 40 зваротаў па азначанай тэме. **Намеснік старшыні грамадскай арганізацыі «Белая Русь» Сяргей ПІГАРАЎ** праінфармаваў, што бізнес-супольнасць, як правіла, прапаноўвала знізіць падатковую нагрузку, стаўкі па крэдытах, памеры штрафаў і колькасць праверак. «Радавых жа грамадзян турбуе, як лібералізацыя адаб'ецца на іх непасрэдным дабрабыце. Нават у цяперашніх умовах жорсткага рэгулявання бізнесу мы сутыкаемся з грубымі парушэннямі нормаў працоўнага заканадаўства пры прыёме на працу і звальненні з боку прадпрымальнікаў. Не ўсім грамадзянам зразумелыя падыходы да цэнаўтварэння. Да гэтага часу мае месца выплата заработнай платы ў канвертах. І калі на момант яе атрымання работніка ўсё задавальняе, то на момант выхаду на пенсію і вылічэння памераў гэтай пенсіі ўзнікаюць пытанні. Калі мы будзем разглядаць толькі апошні факт, то ён ужо ў недалёкай будучыні можа стаць прычынай сур'ёзных сацыяльных хваляванняў».

Вельмі важна фарміраваць пазітыўны вобраз прадпрымальніка. Зараз, як адзначыў **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па эканамічнай палітыцы Уладзіслаў ШЧЭПАЎ**, узровень ведаў у фінансавай і юрыдычнай сферах і гатоўнасць моладзі займацца прадпрымальніцтвам вельмі нізкія. Павышаць іх можна праз дадатковыя курсы ў раёнах ці спецыяльныя дысцыпліны ў навучальных установах.

Камісія па эканамічнай палітыцы ўдзельнічае ў падрыхтоўцы пакета законапраектаў. «Найважнейшы дакумент у пакеце, — на думку Уладзіслава Шчэпава, — Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях, які непасрэдна разглядаецца дэпутатамі і будзе дапрацоўвацца і прымацца. Цяпер у Палаце прадстаўнікоў таксама знаходзяцца заканадаўчыя акты, якія датычацца Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях, Крымінальнага кодэкса, у якіх канкрэтна разглядаюцца нормы па дэкрыміналізацыі эканамічных злачынстваў і складаў злачынстваў».

— У нас ідзе цяпер рэструктурызацыя эканомікі, — кажа **намеснік старшыні Савета па развіцці Сяргей НАВІЦКІ.** — І гэты працэс так ці інакш будзе звязаны з акцыянаваннем прадпрыемстваў. Можа быць, некаторыя прадпрыемствы, якія не змогуць выжываць, прыйдзецца закрываць, нейкая колькасць людзей могуць апынуцца незапатрабаванымі. Гэты дакумент накіраваны на тое, каб людзі, якія, магчыма, страцяць па розных прычынах працу, маглі знайсці сябе як прадпрымальнікі або заснавальнікі ўласнага бізнесу.

Надзея АНІСОВІЧ. *anisovich@zviazda.by*